ІСНУЕ З 1925 ГОДА

НАШАМУ НАРОДУ заўсёды была ўласціва цяга да кнігі, да ведаў. Але толькі пасля Вялікага Кастрычніка просты чалавек займеў магчымасць прыпасці да гэтай невычарпальнай крыніцы, узяць кнігу спадарожніцай і памочніцай у будаўніцтве новага жыцця.

Цяпер ужо мы не ўяўляем сабе жыцця без чытання. А давайце зробім невялікі экскурс у сваю недалёкую гісторыю. У сярэднім на сто душ насельніцтва Віцебскай губерні прыпадала толькі чатыры пісьменныя. Ва ўсім нашым краі прыдзвінскім было... сем самастойных бібліятэк. У агульным даведніку па гораду Віцебску за 1913 год чытаем, што тут «мелася адна грамадская бібліятэка, якая знаходзілася ў жабрацкім стане з-за адсутнасці сродкаў. Горад асігнаваў на яе ўтрыманне і кнігі толькі 50 рублёў у год. Астатнія сродкі чэрпаліся з членскіх узносаў і абанементнай платы. Грамадскае жыццё ў горадзе амаль адсутнічала. Астатнія малалікія культурныя ўстановы былі вузкаспецыяльнымі і маладаступнымі шырокай публіцы». Каментарыі, як кажуць, залішнія.

І вось новая лічба: цяпер у вобласці працуе 1407 бібліятэк з кніжным фондам 8 мільёнаў экземпляраў.

ВЫКОНВАЮЧЫ ЛЕНІНСКІЯ ЎКАЗАННІ аб метадычным і практычным кіраўніцтве сеткай бібліятэк, 14 кастрычніка 1925 года па рашэнню Віцебскага акруговага выканаўчага камітэта ў нашым горадзе было арганізавана аддзяленне Дзяржаўнай бібліятэкі БССР. Пазней яно пераўтворана ў самастойную абласную бібліятэку імя Уладзіміра Ільіча Леніна. У яе фондах да Вялікай Айчыннай вайны налічвалася ўжо 100 тысяч кніг. Але ў час акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі па-варварску знішчылі гэты неацэнны скарб.

У цяжкіх умовах пасляваеннага часу давялося аднаўляць бібліятэчную гаспадарку ў горадзе. Невялікаму калектыву выдзелілі два пакойчыкі, што захаваліся ад разрухі. Але гэта што! Не было ж ніводнай кніжкі. Ды людзі ўжо ведалі, што ў горадзе адрадзілася бібліятэка. Спачатку самі чытачы і дапамаглі. Яны з ахвотай прыносілі захаваныя кніжкі, і гэта з'явілася тым вытокам, адкуль абласная бібліятэка пачала сваё новае рэчышча.

А ў хуткім часе вялікую дапамогу аказаў нам дзяржаўны кніжны фонд Масквы і Ленінграда, які накіраваў у Віцебск значную колькасць літаратуры. Паступілі выданні з Казахстана і іншых рэспублік краіны. Наладзіліся сувязі амаль з усімі буйнейшымі бібліятэкамі Саюза. Кніжны голад, такім чынам, адолелі.

Усе наступныя гады былі напоўнены далейшай упорнай і карпатлівай працай па камплектаванню кніжнага фонду і паляпшэнню прапаганды літаратуры. Зноў-такі зробім параўнанне. У 1946 годзе бібліятэка мела 50 тысяч тамоў, чатыром тысячам чытачоў выдадзена 79 тысяч кніг. А ў 1965-м 14242 чалавекі карысталіся фондам у 300 тысяч тамоў, зроблена 347 тысяч кнігавыдач.

А ПОШНІМ ЧАСАМ мы пачалі перарастаць самі сябе. Старое памяшканне ўжо не магло задаволіць усіх жадаючых карыстацца бібліятэкай.

Сёння словы шчырай удзячнасці тысяч нашых чытачоў звернуты да партыйных і савецкіх органаў, якія ўлічылі нашы ўзросшыя патрэбы і выдзелілі сродкі на будаўніцтва новага памяшкання бібліятэкі. Больш месяца назад палац кнігі прыняў віцяблян. Прасторнае і светлае памяшканне на 500 тысяч тамоў адказвае асноўным патрабаванням, прад'яўляемым да сучасных бібліятэк. Яго карысная плошча складае 5 тысяч квадратных метраў.

На першым паверсе ў нас размяшчаюцца абанемент, аддзел камплектавання і апрацоўкі, чытальная зала перыядычнага друку, аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры, навукова-метадычны аддзел, лекцыйная зала на 200 месц, рэгістратура.

Добрае памяшканне атрымаў навукова-метадычны аддзел, які з'яўляецца цэнтрам арганізацыйна-метадычнага кіраўніцтва масавымі бібліятэкамі вобласці. У прасторным пакоі размясціўся фонд аддзела, выстаўкі метадычных матэрыялаў.

Аматары перыядычнага друку будуць жаданымі гасцямі нашай спецыялізаванай чытальнай залы. Бібліятэка атрымлівае звыш 200 назваў перыядычных выданняў.

На другім і трэцім паверхах размяшчаюцца агульная чытальная зала на 200 месц, зала навуковых работнікаў і спецыялістаў, каталогі, даведачна-бібліяграфічны аддзел, аддзел тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, міжбібліятэчны абанемент і аддзел мастацтва.

Асабліва трэба выдзеліць новы аддзел тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры. Мусім прызнаць, што інжынерна-тэхнічныя работнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі, рабочыя атрымлівалі слабую дапамогу ад нас. Мы рэдка інфармавалі іх аб новай літаратуры. Цяпер становішча карэнным чынам палепшыцца.

Асноўныя працаёмкія працэсы механізаваны. Літаратура з кнігасховішча ў аддзелы абслугоўвання паступае цяпер на малагрузавым ліфце. Канал падзення дазваляе хутка падаваць шыфраваныя заказы ў асноўнае кнігасховішча. Для размнажэння метадычных і бібліяграфічных матэрыялаў набыта друкарская машына — ратапрынт.

Кнігасховішча, у якім размясцілася асноўная маса літаратуры, абсталявана добрымі металічнымі стэлажамі, на якіх можа размясціцца 300 тысяч кніг. Агульная даўжыня паліц — каля 10 кіламетраў. У новым памяшканні змогуць адначасова працаваць над кнігай 400 чалавек.

Галоўнай сваёй задачай калектыў абласной бібліятэкі лічыць аказанне дапамогі партыйным арганізацыям у камуністычным выхаванні працоўных. Мы павінны весці яшчэ больш шырокую прапаганду палітычнай, навуковай, тэхнічнай і вытворчай літаратуры, палепшыць даведачна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне ўсіх чытачоў, павысіць узровень арганізацыйна-метадычнага кіраўніцтва масавымі бібліятэкамі і кардынацыю работы бібліятэк розных ведамстваў, вывучаць, абагульняць, а галоўнае — укараняць перадавы вопыт.

Для гэтага створаны ўсе ўмовы.

А. ФІЛІМОНАЎ,
намеснік дырэктара абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.